# § 24. Расія ў эпоху Пятра Вялікага

1700—1721 гг. 1703 г. 1709 г. 1721 г.

**Успомніце.** *Якія пераўтварэнні ў Расіі адбыліся пры Аляксею Міхайлавічу? У чым праяўлялася адставанне Расіі ад іншых краін Заходняй Еўропы? Якую важную знешнепалітычную задачу так і не здолелі вырашыць першыя Раманавы?*

Час Пятра Вялікага — гэта цэлая эпоха вялікіх рэформаў і пераўтварэнняў, эпоха глыбокага і карэннага абнаўлення ўсяго рускага грамадства.

**Вы даведаецеся.** *Якія змены адбыліся ў Расіі ў выніку рэформаў, праведзеных Пятром I. Якім чынам Расія змагла атрымаць выхад да Балтыйскага мора. Чаму Пятра I называюць Вялікім.*

**1. Перадумовы і пачатак пятроўскіх рэформаў.** Нягледзячы на пераўтварэнні падчас кіравання Аляксея Міхайлавіча, Расія па-ранейшаму адставала ад перадавых краін Еўропы. Краіна не мела ні моцнай рэгулярнай арміі, аснашчанай сучаснаю зброяй, ні ваенна-марскога флоту, ні развітой мануфактурнай прамысловасці.



Масква XVII ст. Рэканструкцыя *Міхаіла Кудраўцава*

*Якія адметнасці рускіх гарадоў адлюстраваны на карціне?*

*Якія дзяржавы кантралявалі Балтыйскае і Чорнае моры?*

Не мела Расійская дзяржава і зручных выхадаў да мораў. Усе спробы вырашыць гэтую знешнепалітычную задачу былі безвыніковыя.

Каб дабіцца жаданай мэты, належала правесці рэформы ў розных сферах жыцця рускага грамадства, што і было зроблена напачатку XVIII ст. Гэтыя рэформы звязаны з імем выбітнага цара-рэфарматара Пятра I.

***Пётр I (1672—1725)*** быў абвешчаны царом у дзесяцігадовым узросце. У выніку яго кіравання Расія стала магутнай імперыяй.



Пётр Вялікі. Мастак *Сяргей Кірылаў*. 1984 г.

230—232

У 1696 г. Пётр I першым з рускіх цароў наведаў Заходнюю Еўропу. Ён пабываў у Германіі, Нідэрландах, Англіі. Менавіта тут Пётр I зразумеў, як шмат Расіі неабходна пераняць у Захада. Падчас свайго падарожжа цар працаваў на галандскай верфі (месца пабудовы і рамонту суднаў), вывучаў стрэльбы і гарматы, наведваў лякарні і тыпаграфіі, спасцігаў усё запар. У Расію манарх вярнуўся перакананым прыхільнікам рэформаў і пераўтварэнняў. У краіну былі запрошаны больш за сто замежных інжынераў, караблебудаўнікоў і матэматыкаў. За высокі заробак яны перадавалі рускім свае веды, уменні і навыкі.



Паводле ўказа Пятра I абразаюць бароды. Лубок. XVIII ст.

Пётр I вырашыў, што рускія мусяць ва ўсім нагадваць еўрапейцаў. Знатным людзям ён загадаў абстрыгчы доўгія бароды і апранухца ў еўрапейскую вопратку. Дазвалялася курыць тытунь. Тых, хто не хацеў адмаўляцца ад старых звычаяў і падпарадкоўвацца, цар строга караў. Праўда, можна было адкупіцца. Напрыклад, хочаш насіць бараду — плаці падатак (для дваранiна ён складаў 60 рублёў, для купца — 100 рублёў, для селяніна — 2 дзенгі).

Неяк, працуючы на суднаверфі, Пётр зняў капялюш перад адміралам і папрасіў дазволу прыступіць да працы. І толькі пасля гэтага цар пачаў аддаваць распараджэнні ніжэйшым чынам.

*Як вы лічыце, чаму Пётр I так зрабіў? Як вы ацэньваеце яго ўчынак?*

Наступным крокам стала замена Баярскай думы Сенатам, што цалкам падпарадкоўваўся волі цара. Старую прыказную сістэму ліквідавалі і замест мноства прыказаў увялі 12 калегій (міністэрстваў). Была рэфармаваная і сістэма мясцовага кіравання. Краіна дзялілася на губерні, на чале якіх ставіліся найбліжэйшыя паплечнікі Пятра.

*У інтарэсах якога саслоўя былі здзейсненыя гэтыя пераўтварэнні? Як вы лічыце, чаму менавіта на гэтае саслоўе абапіраўся Пётр I?*

Царква пачала кантраляваецца дзяржавай. Замест патрыяршаства стваралася Духоўная калегія, або Сінод. Царкоўныя даходы перадаваліся ў царскую казну. Усе гэтыя рэформы ўзмацнілі ўладу чыноўнікаў у цэнтры і на месцах.

Пётр I ліквідаваў розніцу паміж баярствам і дваранствам. Маёнткі дваран ёнураўнаваў з вотчынамі. Дваранская служба, вайсковая або грамадзянская, стала пажыццёваю. Уводзілася «Табель аб рангах», якая ўтрымлівала правілы прасоўвання па службе. Згодна з ёю таленавітыя людзі маглі за службу атрымаць асабістае ці патомнае дваранства. Дваранскіх дзяцей пачалі адпраўляць вучыцца за мяжу. Вялікую ўвагу Пётр I надаваў і айчыннай школе. Быў спрошчаны рускі алфавіт, пачалі выпускаць падручнікі. Вялікі ўклад у развіццё адукацыі і распаўсюджванне навуковых ведаў у Расіі ўнёс ураджэнец Беларусі Ілья Капіевіч. Па даручэнні цара ён падрыхтаваў і выдаў дзясяткі вучэбных дапаможнікаў па гісторыі, арыфметыцы, астраноміі, ваеннай і марской справе.

*Складзіце схему арганізацыі кіравання Расійскай дзяржавай у часы Пятра I.*

227—228

**2. Знешняя палітыка Пятра I. Ваенна-эканамічныя рэформы.** Асаблівую ўвагу Пётр I надаваў умацаванню ваеннай магутнасці Расіі. Пасля няўдалай аблогі турэцкай крэпасці Азоў, што стаяла ў вусці Дона, цар выдаў указ аб будаўніцтве флоту (1696 г.). У Варонежы былі створаны

буйны`якарабельныя верфі і спушчаны на ваду новыя судны. Менавіта яны і забяспечылі перамогу рускіх над туркамі падчас другога паходу на Азоў.

*З дапамогай карты ў атласе вызначце, якія магчымасці адкрывала для Расіі валоданне Азовам.*

Амаль усё цараванне Пятра I суправаджалася войнамі. Самай працяглай і кровапралітнай сярод іх стала Паўночная вайна са Швецыяй у ***1700–1721 гг.*** — за выхад да Балтыйскага мора, якое ў XVII ст. называлі «шведскім возерам». Пачатак вайны склаўся крайне няўдала для Расіі. Увосень 1700 г. шведскі кароль Карл XII з 12-тысячным войскам перамог амаль 40-тысячную рускую армію ў бітве пад Нарвай. Пётр I вынес урокі з цяжкага паражэння і пачаў паспешліва праводзіць ваенную рэформу.

Замест стралецкіх войскаў фарміраваліся палкі «новага строю» на аснове рэкруцкага набору. Кожныя 20 сялянскіх сем'яў аддавалі аднаго салдата — ***рэкрута*** — для пажыццёвай службы.

Адначасова стваралася мануфактурная прамысловасць для вытворчасці жалеза, медзі, сукна, канатаў і ветразяў. Купцы, якія заводзілі прыватныя мануфактуры, атрымоўвалі льготы. Гарматныя двары і арсеналы выраблялі ўзбраенне для арміі.

28 верасня (9 кастрычніка) 1708 г. рэфармаваная руская армія нанесла паражэнне шведам на паўднёва-ўсходнім кірунку ад Магілёва, ля вёскі Лясная. У гісторыі бітва пры Лясной стала вядомая як маці Палтаўскай бітвы. У 1709 г. у бітве пад Палтавай рускія войскі ўшчэнт разбілі шведскую армію.

З нагоды перамогі ў Палтаўскай бітве Пётр I учыніў пір. Сярод прысутных гасцей знаходзіліся палонныя шведскія генералы. Падчас святкавання Пётр узняў келіх за здароўе сваіх настаўнікаў у ваенным мастацтве. Адзін са шведаў спытаў, каго ж ён лічыць сваімі настаўнікамі.

*Як вы думаеце, што Пётр I адказаў на гэтае пытанне?*



Палтаўская бітва.
Мастак *П'ер Дэні Мартэн Малодшы*. 1726 г.

229



Пётр Вялікі. Заснаванне Санкт-Пецярбурга. Мастак *Аляксей Венецыянаў*. 1838 г.

У 1709 г. рэфармаваная руская армія нанесла знішчальнае паражэнне шведам у бітве пад Палтавай. У 1714 г. рускі флот атрымаў перамогу над шведскім у Балтыйскім моры каля мыса Гангут. Паводле Ніштацкай мірнай дамовы (1721) Швецыя саступіла Расіі Ліфляндыю, Эстляндыю і частку Карэліі. Расія набыла выхад да Балтыйскага мора. Так Пётр I вырашыў задачу, якой не маглі даць рады яго папярэднікі: Іван Грозны, Барыс Гадуноў, Аляксей Міхайлавіч.

**3. Ператварэнне Расіі ў імперыю. Асоба Пятра I.** Пётр I ва ўсіх адносінах быў незвычайны чалавек і правіцель: высокая двухметровая постаць, востры іназіральны розум, бязмежная энергія і рашучасць. Ён выказваў цікавасць да многіх галін ведаў, але аддаваў перавагу тым, што мелі практычнае значэнне: матэматыцы, механіцы, караблебудаўніцтву, чарчэнню, хірургіі.

Яшчэ да перамогі над шведамі Пётр I вырашыў пабудаваць новую сталіцу ля вусця Нявы на гразкім багністым беразе Фінскага заліва. Будаўніцтва пачалося ў 1703 г. Горад быў названы Санкт-Пецярбургам. Ён стаў помнікам магутнасці і велічы Пятра I. Праз яго Расія магла падтрымліваць прамыя зносіны з Заходняй Еўропай. Пётр I ажыццявіў сваю мару — ён «прабіў акно» ў Еўропу і ператварыў Расію ў магутную дзяржаву.



Помнік Пятру I у Санкт-Пецярбургу. Скульптар *Эцьен Марыс Фальканэ*. 1768–1770 гг.

*Як вы лічыце, які сэнс уклаў аўтар у гэтую скульптуру?*



Від уніз па Няве-рацэ паміж Зімнім палацам і Акадэміяй навук. Мастакі *Яфім Вінаградаў* і *Рыгор Качалаў*. 1753 г.

*Параўнайце выяву Санкт-Пецярбурга з выявай Масквы на с. 160. Якія прыкметы паказваюць на тое, што Санкт-Пецярбург — зусім новы для Расіі горад?*

Аднак перамены былі дасягнутыя коштам неверагоднага напружання ўсіх сіл рускага народа. Прыгонны гнёт не толькі захаваўся, але і ўзмацніўся. Голад і падаткі, прымусовая адпраўка работнікаў на верфі і будоўлю крэпасцей прыводзілі да бунтаў і мяцяжоў, якія цар спыняў з надзвычайнай жорсткасцю.

Пётр I асабіста распраўляўся з праціўнікамі пераўтварэнняў. Сек галовы стральцам, што паўсталі супраць яго ў 1698 г. Не пашкадаваў нават сына. Па загадзе цара суд прыгаварыў царэвіча Аляксея да смяротнага пакарання за спробу вярнуць старыя парадкі. Паводле некаторых ацэнак, з 14—17 млн жыхароў Расіі падчас праўлення Пятра I загінуў кожны дзясяты чалавек. «Усякі бунт, мяцеж і ўпартасць без усякай літасці маюць быць шыбеніцай пакараныя», — сцвярджалася ў адным з царскіх указаў.

22 кастрычніка 1721 г. рускі цар быў абвешчаны імператарам усерасійскім, а сенат ўганараваў яго тытуламі «Вялікі» і «Айцец Айчыны».

*Такім чынам, Пётр I быў вялікім рэфарматарам. Аднак сучаснікі ставіліся да яго па-рознаму. Адны любілі і паважалі. Другія вінавацілі ў жорстка-*

*Абярыце для сябе пазіцыю абаронцы або праціўніка пятроўскіх рэформаў. Пацвердзіце ваша меркаванне прыкладамі з параграфа.*

*сці і лічылі крыніцай многіх бед Расіі. Спрэчкі вакол асобы Пятра I працягваюцца пагэтуль. Для адных ён цар-асветнік, «то академік, то герой, то мараплавец, то рамеснік» (А. Пушкін). Для іншых — дэспат і тыран. Пра асобу Пятра Вялікага напісана шмат навуковых прац і мастацкіх твораў, але песень аб ім пры яго жыцці народ не складаў.*

**Князь-акадэмік з «гнязда Пятрова»**

Пётр Вялікі збіраў вакол сябе такіх жа людзей, як ён сам, — яркіх і адораных. Адным з іх быў найсвятлейшы князь Аляксандр Данілавіч Меншыкаў.
Гэта сапраўды каларытная постаць! Сын простага гандляра блінамі, ён стаў буйны́м дзяржаўным дзеячам. Пры гэтым, што ўражвае, Меншыкаў быў зусім непісьменны. Ён мог толькі намаляваць сваё імя. Можна сабе ўявіць, які талент меў Меншыкаў, калі ён кіраваў Пецярбургам, заключаў дамовы, вёў войны, адзін час узначальваў Ваенную калегію, гэта значыць з'яўляўся міністрам абароны.
І яшчэ адзін надзвычайны факт. Англічане абралі Меншыкава членам Лонданскага каралеўскага таварыства — у той час самай ганаровай акадэміі ў Еўропе. Дыплом аб абранні найсвятлейшага князя Аляксандра Данілавіча Меншыкава акадэмікам падпісаў прэзідэнт каралеўскага таварыства сэр Ісак Ньютан.

***Ключавыя словы:*** *Пётр I, Паўночная вайна, рэкрут, Санкт-Пецярбург, бітва пад Палтавай.*

**Пытанні і заданні**

1. Якія задачы стаялі перад Расійскай дзяржавай напрыканцы XVII ст.? З чаго пачаў вырашэнне гэтых задач Пётр I?
2. Якія пераўтварэнні былі зроблены Пятром I у сістэме дзяржаўнага кіравання? Як гэта паўплывала на ўладу цара?
3. Якое значэнне для Расіі мела перамога ў Паўночнай вайне? Ахарактарызуйце Паўночную вайну, выкарыстоўваючы памятку 3 (с. 221).
4. Якія станоўчыя, а якія адмоўныя вынікі праўлення Пятра I вы маглі б назваць?
5. Падрыхтуйце паведамленне пра найбольш цікавыя, на вашу думку, пераўтварэнні Пятра I.